# Выхаванне візуальнай і чытацкай культуры дзяцей і падлеткаў бібліятэчнымі сродкамі

**Л. А. Дзямешка,**
прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы;
**С. А. Паўлава,**
прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы
(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў)

Аўтары разглядаюць праблемы ўзаемадзеяння візуальнай і чытацкай культуры дзяцей і падлеткаў — чытачоў бібліятэк. На іх думку, менавіта ад гэтага на сучасным этапе залежыць фарміраванне асобы, яе кругагляд, духоўнае развіццё, рэальны ўклад у далейшае ўдасканаленне грамадства ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадства XXI стагоддзя лічыцца грамадствам ведаў. Гэты інтэлектуальны капітал вызначае далейшае развіццё чалавецтва. Адукацыя становіцца адным з магістральных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі, арыентуе чалавека ў выбары жыццёвага шляху.

У Рэспубліцы Беларусь паспяхова здзяйсняецца станаўленне ўласнай, нацыянальнай сістэмы адукацыі. У яе уваходзяць бібліятэкі з багатымі інфармацыйнымі рэсурсамі, інавацыйнымі камп'ютэрнымі і сацыяльнымі тэхналогіямі, высокакваліфікаванымі кадрамі.

Бібліятэка каардынуе дзейнасць чытацкай аўдыторыі, дапамагае выбіраць друкаваную прадукцыю, успрымаць і асэнсоўваць яе. Сучасныя даследаванні сведчаць пра змяншэнне інтарэсу дзяцей і падлеткаў да чытання.

Адзначана найбольшая зацікаўленасць дзяцей і падлеткаў візуальнай інфармацыяй, масавае захапленне Інтэрнетам, камп'ютэрнымі гульнямі, кіна-, відэа- і тэлепраграмамі, што ў выніку зніжае інтарэс да чытання. На Захадзе гэты працэс акрэслілі як «крызіс чытання». Цікава прасачыць яго праявы ў розных краінах напрыканцы XX і на пачатку XXI ст.

У Германіі, згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, праведзенымі у канцы XX ст., дзеці 9–11 гадоў звяртаюцца да сродкаў масавай інфармацыі ў сярэднім тры гадзіны на дзень; першую палову гэтага часу займае прагляд тэлепраграм, другую — камп'ютэрныя гульні і праслухоўванне аўдыёкасет. У 11–12-гадовым узросце час на камп'ютэрныя гульні павялічваецца да 2 гадзін у дзень, а на чытанне змяншаецца да 0,5 гадзін. Гэтаму садзейнічае развіццё кабельнага тэлебачання, відэа- і аўдыётэхнікі (па матэрыялах часопіса «Штэрн»).

У Францыі (даследаванне праводзілася у 80–90-я гг. XX ст.) роля чытання ў жыцці дзяцей і падлеткаў стала значна ніжэйшай. 25 % рэспандэнтаў 8–16 гадоў за 3 месяцы 1992 г. не прачыталі ніводнай кнігі, а сярод 14–16-гадовых гэты працэнт павялічыўся да 33. Пры гэтым кожны другі падлетак лічыць, што чытанне з'яўляецца «цяжкім і непатрэбным абавязкам» [1].

У ЗША адзначаны негатыўны ўплыў тэлебачання на выхаванне дзяцей. Баявікі, дэтэктывы, рэкламныя застаўкі, героі якіх вядуць сябе асацыяльна, грэбуюць граматыкай, правільным вымаўленнем слоў, не спрыяюць добраму выхаванню. З кожным годам зніжаецца чытанне сярод дзяцей і падлеткаў.

У Японіі новае пакаленне дзяцей «тэлебачання» называюць «тэрэбіко». У гэту з'яву ўключаны аднагадовыя дзеці, якія ўжо могуць імітаваць вядомых тэлеперсанажаў; трохгадовыя, якія праводзяць каля экранаў да пяці гадзін штодзённа; з 10-гадовага ўзросту многія рэгулярна глядзяць перадачы, прызначаныя для дарослых, чытачоў сярод іх амаль не назіраецца.

У 1988–1992 гг. у Расіі праводзілася даследаванне. Адзначана тэндэнцыя запаволенага ўваходу дзяцей у кніжную культуру. У малодшых школьнікаў адсутнічае стабільная звычка да чытання. У падлеткаў чытанне кніг займае толькі пятае месца [2].

Такая праблема існуе і ў Рэспубліцы Беларусь. Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага даследавання «Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь» [3]. Атрыманыя звесткі сведчаць пра зніжэнне цікавасці да чытання, выцясненні кніг іншымі сродкамі інфармацыі. Дзеці і падлеткі часцей звяртаюцца да праслухоўвання аўдыё- і прагляду відэапраграм. Культура робіцца больш масавай. Было высветлена, што чытанне не ўспрымаецца як від дзейнасці, што патрабуе адпаведных навыкаў і намаганняў.



У краіне ідзе інтэнсіўны пошук шляхоў узнаўлення чытацкага інтарэсу да чытання, актывізацыі працэсу інкультурацыі дзяцей і падлеткаў. Пра гэта, ў прыватнасці, сведчыць паступовае выкананне прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі», якая прадугледжвае набыццё вопыту ўзаемадзеяння розных арганізацый, органаў, устаноў; сумеснае правядзенне мерапрыемстваў з мэтаю развіцця асобы дзіцяці, выкарыстанне дзеля гэтага інавацыйных тэхналогій [4].

Асаблівую ўвагу набывае дзейнасць бібліятэк па вырашэнні і стымуляванні станоўчага ўплыву візуальнай культуры на чытанне. Інакш кажучы, неабходна знайсці сімбіёз візуальнай і чытацкай культуры. Для гэтага трэба вызначыць іх падабенства і адрозненні.

Звернемся да тэарэтычных асэнсаванняў тэрмінасістэмы. Тэрміны **візуальная культура, візуальнае мысленне, візуальнае ўспрыманне, візуальныя камунікацыі, візуальныя мадэлі** шырока ўжываюцца ў тэорыі дызайну, псіхалогіі, педагогіці, мастацтва, а таксама ў семіётыцы, культуралогіі і інш.

Мадэлі візуальных камунікацый апісаны Р. Арнхеймам, В. Зінчанка, А. Запарожцам, В. Розіным, Б. Чарневічам, Ф. Успенскім, А. Ляонцьевым [5]. Са сферы кінамастацтва да нас дайшлі адкрыцці, зробленыя ў 20-я гг. XX ст. рэжысёрам С. Энштэйнам і аператарам Д. Вертавым, а ў філасофскім ракурсе — мысліцелем, багасловам і тэарэтыкам выяўленчага мастацтва П. Фларэнскім [6]. Розныя аспекты візуальнасці разглядаюцца тэарэтыкамі з пазіцый аб'екта і прадмета даследавання. Таму і шматлікія тэрміны, на думку вядомых расійскіх псіхолагаў У. Зінчанка і В. Розіна, не маюць строгіх агульнапрынятых дэфініцый, а толькі мноства ўяўленняў, якія ахопліваюць такія з'явы, як зрокавае (аптычнае) і інтэлектуальнае бачанне, зрокавае ўспрыманне і мысленне. Зрокавы вобраз, як адзначае Р. Арнхейм, даволі аб'ёмны, таму што ў ім адначасова адлюстроўваецца інфармацыя аб каляровых, прасторавых, дынамічных і фігуратыўных характарыстыках прадметаў, да таго ж ён вельмі пластычны [5, с. 20].

Пагаджаючыся з гэтым пунктам гледжання, мы разглядаем канцэпцыю сучаснай візуальнай культуры з пазіцыі бібліятэказнаўства, як падыход да асваення бібліятэчнай прасторы і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі. Самакаштоўнасцю становіцца прадметнае асяроддзе, у тым ліку і інфармацыйныя рэсурсы, рарытэты, меморыі. Важна адзначыць, што ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці праблема выхавання візуальнай і чытацкай культур мае некалькі аспектаў. Неабходна дасканалае вывучэнне як аб'екта выхавання (дзяцей, падлеткаў), так і зместу візуальнай і чытацкай культур. Вядомы расійскі сацыёлаг С. А. Плотнікаў вылучае тры асаблівасці візуальнай культуры на прыкладзе захаплення дзяцей і падлеткаў тэлебачаннем: тып увагі, асаблівасці зместу, характар успрымання [1, с. 18].

*Тып увагі.* Тэлебачанне даступна ўсім, яно не патрабуе папярэдняй падрыхтоўкі і лёгка ўспрымаецца. Бібліятэкары сведчаць, што дзеці, якія шмат часу праводзяць перад тэлевізарам, уваходзяць у свет чытання больш нецярплівымі і рассеянымі. Іх чытацкае развіццё запавольваецца (з'явілася нават вызначэнне «лянівы чы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

тач»). Звычайна гэтыя чытачы бібліятэкі — дзеці з адукаваных сямей. Яны маюць пэўныя навыкі чытання, але не здольныя задумацца над сэнсам прачытанага і прааналізаваць атрыманую інфармацыю.

Педагог Дональд Бар пісаў пра «лянівых чытачоў»: «Дзеці могуць прагартаць шмат кніг, але тое, што яны робяць, з кожным годам усё менш становіцца падобным на чытанне. Тэлебачанне прымушае дзіцячыя вочы скакаць па старонках кнігі, а гэта вельмі далёкая ад чытання рэч» [1, с. 19].

«Лянівы чытач» часцей выбірае кнігі, у якіх адсутнічаюць сюжэт, логіка, а значыць няма неабходнасці чытаць іх з пачатку да канца. Дзеці шукаюць кароткія захапляльныя тэксты, малюнкі; найчасцей ім падабаюцца коміксы і часопісы, дзе больш ілюстрацый, а не тэксту. Іх можна праглядаць, гартаць, пачынаць з пачатку або з канца. Такія кнігі не патрабуюць сфакусіраванай увагі, але утрымліваюць забаўляльную інфармацыю для дзіцяці, якое не прывыкла да паслядоўнага чытання.

Каб прывабіць увагу 7–8-гадовых дзяцей да сур'ёзнага чытання, бібліятэкары рэкамендуюць ім кнігі серый «Для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў», «Кніга ў падарунак», «Бібліятэка дзіцячай класікі». Індывідуальная работа з дзецьмі і падлеткамі з цягам часу дае вынікі. Напрыклад, у Мінскай дзіцячай бібліятэцы імя Янкі Маўра назіраецца попыт на кнігі Вадзіма Карастылёва, на творчасці якога вырасла не адно пакаленне.

На жаль, сярод выдадзеных за апошні час дзіцячых кніг мала беларускіх. Тым больш прыемна, што пасля адкрыцця ў бібліятэцы выставы «Кнігі, якія любяць дзяцей» падлеткі зацікавіліся зборнікам беларускага аўтара В. Кудлачова «Калі дзеці смяюцца», які выйшаў у 2006 г. у выдавецтве «Адукацыя і выхаванне», а таксама зборнікам Н. Галіноўскай «Палёт з Карлсанам». Гэтыя кнігі нам уяўляюцца ўрокамі патрыятызму. Яны выклікаюць у маленькага чалавека жаданне ганарыцца сваёю зямлёй, мовай, асэнсоўваць, у якой краіне ён жыве. Намаганні бібліятэкараў садзейнічаюць змяншэнню колькасці «лянівых» чытачоў [7].

Другой асаблівасцю візуальнай культуры С. А. Платонаў лічыць *асаблівасці зместу*. Тэлебачанне прадастаўляе гледачу вялікую колькасць шматлікіх звестак. Як правіла, яны цікавыя, забаўляльныя, пазнавальныя, але бессістэмныя і раскіданыя ў часе, падзеях, прасторы, але, як мазаіка, не даюць цэласнай карціны. Кніга ўяўляе сабою арганізаваны матэрыял, у якім сканцэнтравана сістэма пэўных ведаў, назіранняў, вобразаў, пачуццяў.

Трэцяя асаблівасць — *характар успрымання*. Для тэлебачання ўласцівы пэўны тэмп, хуткасць, дынаміка, бесперапыннае дзеянне. Чытанне, як працэс, застаецца павольным, удумлівым, няспешным. Яно ўяўляе сабою творчасць, якая не церпіць паспешлівасці. Звернемся да больш дэталёвага яго разгляду. Чытанне, па вызначэнні ў тэрміналагічных слоўніках, энцыклапедыях, з'яўляецца «адной з форм камунікатыўнай, пазнавальнай і духоўнай дзейнасці асобы; спосабам моўных стасункаў людзей сродкамі друкаваных, рукапісных, электронных тэкстаў» [8, с. 1158].

Гэта найбольш эфектыўная інтэлектуальная тэхналогія засваення назапашаных чалавецтвам ведаў. У межах чытання вызначаюцца: *агульная тэорыя; сацыялогія чытання* (вывучае распаўсюджванне кніг і чытання, іх месца ў сістэме сучасных камунікатыўных сродкаў); *псіхалогія чытання* (разглядае чытацкае развіццё асобы, праблемы ўспрымання тэкстаў); *педагогіка чытання*. Задачай апошняй з'яўляецца выяўленне і абгрунтаванне прынцыпаў і крытэрыяў фарміравання колаў чытання, эфектыўнай сістэмы метадаў прапаганды кніг




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і кіраўніцтва чытаннем. Гэтымі праблемамі займаюцца розныя аўтары. Напрыклад, расійскі бібліятэказнаўца В. А. Барадзіна разглядае чытанне як від камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці. Яе сутнасць заключаецца ў актыўным, мэтанакіраваным пераўтварэнні і падпарадкаванні зместу тэксту розным патрэбнам сацыяльнага суб'екта. З псіхалагічнай пазіцыі, аўтар дала азначэнне чытацкай дзейнасці як аднаго са спосабаў быцця чалавека, псіхалагічная сутнасць якога ў каштоўнасна-арыентацыйным, пазнавальна-камунікатыўным і эмацыянальна-эстэтычным успрыманні, пазнанні, перажыванні, ацэньванні рэальнага ці выдуманага свету рэчаў, людзей, падзей, фактаў, думак, ідэй, пачуццяў, адлюстраваных у друкаваным ці рукапісным тэксце. Даследчыца прадстаўляе акмеалагічную канцэпцыю чытання, у аснове якой закладзена ідэя чытацкага развіцця асобы. Праблемы педагогікі чытання распрацоўваюць расійскія навукоўцы І. І. Ціхамірава, В. А. Лявідаў. Яны вызначылі некалькі падыходаў да вывучэння сутнасці чытання: *інфармацыйны* (пазнавальны); *дзейнасны* (даследаванне суб'екта, аб'екта, мэтаў, сродкаў, аперацый і вынікаў чытання); *працэсуальны* (разуменне чытання як развіцця і змены яго фаз, іх паслядоўнасці і хуткасці працякання); *камунікатыўны* (вывучэнне чытання як спецыфічнага віду зносін паміж аўтарам і чытачом); *знакавы* (вывучэнне спосабаў кадзіравання тэксту); *псіхалагічны* (аналіз свядомасці чытача). Часцей за ўсё чытанне разглядаецца як камунікацыя і дзейнасць. Пры гэтым у большасці выпадкаў тэрміны «чытанне» і «чытацкая дзейнасць» выкарыстоўваюцца як сінонімы і з'яўляюцца ўзаемазамяняльнымі. Сродкамі чытання перадаецца матэрыяльны і культурны (сацыяльны) вопыт. Такім чынам, **сродкамі чытання як камунікацыі сацыяльны вопыт транслюецца ў часе** (з пакалення ў пакаленне) і **ў прасторы** (сацыяльны вопыт людзей, якія належаць да розных культур). Выкарыстоўваецца падыход разгляду чытацкай дзейнасці па фазах, ці этапах. Вучоныя вылучаюць тры фазы: *матывацыйна-пабуджальную* (папярэднічае чытанню і пабуджае да яго); *працэсуальна-выніковую* (успрыманне, разуменне і засваенне прачытанага); *выніковa-ацэначную* (вынік і яго ацэнка). Гэтыя ж фазы магчыма разглядаць праз паняцці «падрыхтаванасць — актыўнасць — выніковасць» у псіхалагічным кантэксце. Сярод відаў чытання можна вылучыць *суцэльнае* (азнаямляльнае, вывучаючае, карэктарскае, рэдактарскае, крытычнае) і *выбарачнае* (даведачна-арыентацыйнае, азнаямляльна-праглядальнае, пошукавае); *дзелавое* і *рэкрыяцыйнае* (чытанне ў вольны час); *хуткае* (беглае) і *павольнае* (удумлівае).

Першапачатковае захапленне чытаннем прывіваецца ў сям'і з першымі дзіцячымі кніжкамі. Гэта час пасіўнага чытання: дзіця «праслухоўвае» інфармацыю. Ад умення бацькоў выразна прачытаць казку залежыць вынік, яны выступаюць у ролі артыстаў з рознай інтанацыяй і зменай тэмбру голасу. Дзіця вучыцца не толькі ўспрымаць тэкст, але і суперажываць героям, атрымліваць задавальненне ад кнігі, з нецярпеннем чакаць працягу чытання. Вядучая роля ў станаўленні маленькага чытача належыць бацькам, сям'і, а за межамі дома — выхавацелям дзіцячага сада, школе, бібліятэцы. Такім чынам, яшчэ да наведвання бібліятэкі ў дзіцяці закладваецца неабходнасць чытаць. У выпадку, калі ў сямейным асяроддзі павялічваецца і заахвочваецца чытацкая актыўнасць дзіцяці, яно мае добры шанс не засяроджвацца толькі на тэлебачанні, мульціках, але і стаць сапраўдным чытачом. У адваротным выпадку чытацкае развіццё дзіцяці запавольваецца.

Альтэрнатывай чытанню ў дзяцей з'яўляецца не толькі тэлебачанне, але і камп'ютэрныя гульні. Вядома, сярод іх ёсць і тыя, што развіваюць дзіцячую творчасць, навучаюць асновам навук, як, напрыклад, адукацыйныя і навучальныя праграмы. Але празмернае захапленне імі зніжае чытацкую актыўнасць і часта шкодзіць здароўю дзіцяці.

Згодна з дадзенымі даследаванняў, чалавек запамінае 10 % прачытанага, 20 — ад пачутага і 30 — ад убачанага. Калі ж ён чытае, чуе і бачыць, адбываецца больш поўнае ўспрыманне інфармацыі [9]. Таму аптымальны варыянт — навучанне дзяцей медыяграматнасці, інакш кажучы, неабходнасці спалучаць чытанне, тэлебачанне, відэапраграмы і камп'ютэрныя гульні. У гэтым працэсе нам уяўляецца некалькі напрамкаў дзейнасці.

У першую чаргу неабходна дзяржаўная палітыка ў сферы падтрымкі і стымуляван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ня чытання. У Францыі, напрыклад, існуе праграма «Горад чытання», конкурс чытаючых гарадоў, вандроўка «Цягнік казак», свята чытання. У Амерыцы вялікую ролю ў арганізацыі падтрымкі чытання выконваюць такія нацыянальныя арганізацыі, як Цэнтр кнігі пры Бібліятэцы кангрэса ЗША, Фонд сямейнай граматнасці. У прапагандзе чытання ў многіх краінах удзельнічае не толькі дзяржаўнае, але і кабельнае тэлебачанне.

Па-другое, сродкам масавай інфармацыі (СМІ) неабходна мэтанакіравана навучаць падрастаючае пакаленне мове. Юныя чытачы павінны ведаць усе плюсы, якія даюць СМІ, і ўмець нейтралізаваць іх мінусы. У 1970-я г. распрацоўваліся спосабы прыцягнення школьнікаў да кінамастацтва, ішло навучанне мове кіно. У 1980-я гады увагу педагогаў і даследчыкаў прыцягнула тэлебачанне, з'явіўся тэрмін «візуальная граматнасць». У Францыі існуе прадмет «сацыякультурная адукацыя». Акцэнт робіцца на вывучэнні розных відаў СМІ: фатаграфій, коміксаў, рэкламы, кіно, тэлебачання, відэа, а паралельна зместу і мастацкай прыроды твораў, іх успрымання і ўздзеяння на розум чалавека.

Па-трэцяе, неабходна інтэграцыя, сінтэз візуальнай і чытацкай культур, іх узаемапранікненне і ўзбагачэнне, што магчыма зрабіць намаганнямі розных структур грамадства.

Бібліятэкі выкарыстоўваюць інавацыйныя тэхналогіі па спалучэнні візуальнай і чытацкай культур для заахвочвання дзяцей і падлеткаў чытаннем.

Станоўчай з'явай стала стварэнне пры бібліятэках медыятэк, якія спецыялізуюцца на розных носьбітах інфармацыі. Наменклатура іх паслуг шматлікая: выдача дзецям на дом матэрыялаў (дакументаў); правядзенне культурных праграм, арганізацыя выстаў, прагляд кіна-, відэа- і тэлепраграм з наступным іх абмеркаваннем і рэкамендацыямі прачытаць адпаведныя кнігі; прэзентацыя літаратурных навінак з дапамогай камп'ютэрнай тэхнікі. Некаторыя медыятэкі ўтрымліваюць збор рэпрадукцый карцін (артатэкі), задача якіх — духоўнае і эстэтычнае развіццё дзіцяці. Медыятэкі пашыраюць магчымасці традыцыйнай бібліятэкі па прыцягненні дзяцей і падлеткаў да чытання, спалучаюць візуальную і чытацкую культуру. Гэтаму садзейнічаюць і адпаведныя бібліятэчныя формы абслугоўвання. Пры дзіцячых бібліятэках існуюць і відэатэкі, у якіх носьбітамі інфармацыі з'яўляюцца дыскеты і кампакт-дыскі.

Улічваюцца і новыя рэаліі ў прапагандзе кнігі і ўспрыманні бібліятэкі як кнігасховішча з інфармацыйнымі рэсурсамі. Яе знешні выгляд: пандусы для дзіцячых калясак, чыстыя прыступкі, прыгожы інтэр'ер, фітадызайн, афармленне плакатаў, афіш, фірменная атрыбутыка — уся гэтая візуальная сімволіка з'яўляецца эфектыўным сродкам фарміравання пазітыўных установак, уплывае на настрой, пачуцці і эмоцыі чытачоў. Ідэальнае ўнутрыбібліятэчнае асяроддзе — гэта калі любы элемент ўтрымлівае пэўную інфармацыю.

Паколькі візуальныя арыенціры імгненна ўспрымаюцца юнымі чытачамі, значнае месца ў бібліятэках займае метаінфармацыя. Яе можна класіфікаваць па двух групах: першая дапамагае чытачу арыентавацца ў памяшканні бібліятэкі ці ў яе структурных падраздзяленнях; другая арыентуе на выбар кніг. Да першай групы адносяцца перш за ўсе рэкламныя і кампазіцыйныя арыенціры: аб'явы, схемы, розныя піктаграмы, табло, указальнікі размяшчэння аддзелаў бібліятэкі, выкананыя з мастацкім густам пуцевадзіцелі. Менавіта яны фарміруюць першапачатковае ўспрыманне выгляду пабудовы.

Камп'ютэрныя тэхналогіі прапануюць шырокі спектр метаінфармацыйных сродкаў: розныя, у тым ліку і каляровыя вокны, меню, паказальнікі, кнопкі з выявай прадметаў-сімвалаў, дзеянняў, якія выкарыстоўваюць прынцып мнемонікі і інш.

Метаінфармацыя пры абслугоўванні дзяцей забяспечвае камфортнасць, хуткасць пошуку інфармацыі з дапамогай алгарытмаў бібліяграфічнага пошуку, аблягчае доступ да яе, абумоўлівае характар узаемаадносін бібліятэкара з юным чытачом.

Такім чынам, у бібліятэках ёсць базісны матэрыял для выхавання ў чытачоў візуальнай культуры, непасрэдна звязанай з іх чытацкай дзейнасцю і стымулюючай яе.

Што датычыцца зместу работы бібліятэкара і яго прафесійнай падрыхтоўкі, гэта праблема патрабуе асэнсавання і можа стаць тэмай для наступных нататкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Чудинова, В.* Союз вербальных и визуальных культур / В. Чудинова // Библиотека. — 1999. — № 6. — С. 17–19.
2. *Матлина, С. Г.* Инновационные технологии и разнообразие культур / С. Г. Матлина // Социально-культурные аспекты теории библиотечной инноватики: Румянцевские чтения. — М. : Пашков Дом., 2004. — С. 96–105.
3. *Красавцева, И. Н.* Средства массовой коммуникации в современном социокультурном контексте / И. Н. Красавцева // Социально-политическая ситуация Республики Беларусь: по материалам социологического мониторинга. Сб. науч. тр. — Минск : ИСПИ, 1998. — С. 175–184.
4. Анализ положения детей и женщин в Республике Беларусь. — Минск, БГУ и Центр. соц. и полит. исследовании, 2004. — 104 с.
5. *Арнхейм, Р.* Искусство и визуальное восприятие / Р. Арнхейм. — М. : Искусство, 1974. — 140 с.; *Зинченко, В. П.* Современные проблемы образования и воспитания / В. П. Зинченко // Вопросы философии. — 1973. — № 11. — С. 14–18; *Успенский, Ф. И.* Очерки по истории византийской образованности / Ф. И. Успенский. — СпБ, 1891. — 359 с.; *Запорожец, А.* Восприятие и действие / А. Запорожец, А. Венгер, В. Зинченко, А. Рудская. — М., 1967. — 281 с.; *Черневич, Б.* Язык графического дизайна / Б. Черневич. — М., 1975. — 199 с.; *Розин, В. М.* Визуальная культура и восприятие / В. М. Розин. — М., 2004. — 224 с.; *Леонтьев, А. Н.* Проблемы деятельности в психологии / А. Н. Леонтьев // Вопросы философии. — 1972. — № 9. — С. 104–115.
6. *Флоренский, П. А.* Обратная перспектива / П. А. Флоренский // Труды по знаковым системам. — Тарту, 1967. — С. 394–395, 400.
7. *Дитлова, О.* Книжки, которые любят детей / О. Дитлова // Бібліятэчны свет. — 2007. — № 3. — С. 22–25.
8. Библиотечная энциклопедия. — М. : Пашков Дом, 2007. — 1160 с.
9. *Светлов, Б. В.* Мультимедийная культура как эстетический феномен информационного общества / Б. В. Светлов // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. — 2008. — № 10. — С. 17–24.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ